# Вынікі 2025

Праграма 1. Культура ў прыярытэце 2

Праграма 2. Цэласнасць культурніцкай прасторы 6

Праграма 3. Творца і яго мастацтва як каштоўнасць 8

Што мы зрабілі для інстытуцыйнага развіцця арганізацыі 12

Як мы камунікавалі з аўдыторыяй 13

БЕЛАРУСКАЯ РАДА КУЛЬТУРЫ

Падрыхтавалі, зацвердзілі і прэзентавалі (ёсць нават відэа!) стратэгію Беларускай Рады культуры на 2025–2027 гады. Гэты дакумент і праграмы, якія ён вызначае як асноўныя ў нашай дзейнасці, – галоўны арыенцір працы арганізацыі на 3 гады.

Вось што мы ўжо зрабілі па кожнай з азначаных у Стратэгіі праграм.

# Праграма 1. Культура ў прыярытэце

**Мэты:**

- паказаць, што культура – гэта не толькі творчасць, але і інструмент грамадскіх пераменаў, фармавання ідэнтычнасці, які мае ўплыў на палітыку і эканоміку;
- забяспечыць рост сектару праз супрацу з іншымі сферамі ды залучэнне культуры ў міжнародныя праграмы.

## 1.1. Маніторынг стану і тэндэнцый у культурнай сферы

У 2025 годзе мы працягвалі сістэмна аглядаць тэндэнцыі ў беларускай культурнай сферы – унутры краіны і ў выгнанні. Каб не проста фіксаваць падзеі, а спрыяць разуменню працэсаў, зменаў і доўгатэрміновых наступстваў таго, што адбываецца з культурай ва ўмовах рэпрэсій, эміграцыі і структурных зрухаў.

1. Цягам года з дапамогай Аналітычнай групы падрыхтавалі і апублікавалі шэраг квартальных **аналітычных аглядаў** беларускай культуры, якія сталі асновай публічных дыскусій:

- Студзень–сакавік 2025
- Красавік–чэрвень 2025
- Ліпень–верасень 2025
- Кастрычнік–снежань 2025 (рыхтуецца да публікацыі)

У асобным матэрыяле падвялі **вынікі года** і прадставілі агульны ландшафт беларускай культуры.

Паспрабавалі новы фармат **вялікіх аналітычных аглядаў**, прысвечаных асобным сектарам. Выйшлі тэксты пра акадэмічную музыку і фатаграфію, падрыхтаваныя экспертамі ў гэтых тэмах.

2. Важным кірункам застаецца **даследчая праца**.

Завяршылі і апублікавалі даследаванне дзяржаўнай палітыкі знішчэння нацыянальнай памяці беларусаў у 2020–2024 гадах. Гэтая праца атрымала шырокі розгалас сярод беларусаў і ў колах замежных экспертаў.

Значным вынікам года стала базавае даследаванне поля незалежнай беларускай культуры.

3. Мы сістэмна вядзем **маніторынг сітуацыі ўнутры Беларусі**. Улетку 2025 года правялі 18 глыбінных інтэрв'ю з дзеячамі культуры і актывістамі, якія працягваюць працу ў краіне. На падставе атрыманага матэрыялу падрыхтавалі артыкул.

4. Таксама працавалі ў кірунку **даследавання патрэбаў рэпрэсаваных творцаў**: правялі апытанні і інтэрв'ю з творцамі ў эміграцыі і ў Беларусі (апрацоўка дадзеных яшчэ ідзе).

5. Мы прааналізавалі гендарны склад палітзняволеных дзеячаў культуры і працягнулі маніторынг палітычных зняволенняў, каб на гэтай аснове рыхтаваць новыя аналітычныя і policy дакументы.

6. Шмат увагі надавалі **партнёрствам і ўдзелу ў міжнародных працэсах** – у тым ліку ў замежных даследаваннях, вынікі якіх могуць уплываць на праграмы падтрымкі беларускай культуры.

7. Пашырылі і часткова абнавілі экспертную сетку. У межах падрыхтоўкі новых аналітычных блокаў і тэматычных аглядаў да супрацоўніцтва далучыліся новыя эксперты.

## 1.2. Правядзенне аналізу патрэбаў сектара і распрацоўка policy дакументаў

За 2025 год мы выразна перайшлі ад «агульных размоваў пра патрэбы культуры» да распрацоўкі **пакета інструментаў**, якія можна выкарыстоўваць у перамовах і публічнай адвакацыі.

- Ключавым вынікам стала **Дарожная мапа падтрымкі беларускай культуры на 2026–2028 гады**, распрацаваная ў партнёрстве з Прадстаўніцтвам па Нацыянальным адраджэнні Аб'яднанага Пераходнага Кабінету і іншымі арганізацыямі культурніцкага сектара. Дакумент аб'ядноўвае аналіз патрэбаў, прыярытэты і практычныя рэкамендацыі для міжнародных інстытуцый і донараў. Дарожная мапа была **публічна** прэзентаваная **ў Бруселі** і стала асновай для далейшых дыскусій пра сістэмную падтрымку беларускай культуры.

- Развіваючы адвакацыйны напрамак, падрыхтавалі дакумент **«Культура як фактар бяспекі»**, у якім мы разглядаем культуру як **ключавы элемент устойлівасці, ідэнтычнасці і дэмакратычнай бяспекі Беларусі і Еўропы**. Гэты тэкст стаў важным аргументам у размовах з міжнароднымі партнёрамі і экспертнай супольнасцю.

- Дапаўняючы гэтыя дакументы, мы падрыхтавалі рэкамендацыі **для арганізатараў форумаў і канферэнцый** – «*Як і нашто трымаць культуру ў фокусе*». Гэта практычны гід, які лагічна ўключае культуру ў шырэйшыя грамадскія, палітычныя і міжнародныя дыскусіі, не маргіналізуючы яе.

- Асобнае важнае месца займае пакет матэрыялаў **пра палітвязняў з культурнай сферы**. Матэрыялы, сабраныя ў гэтым раздзеле, сістэматызуюць інфармацыю пра рэпрэсіі і даюць аснову для далейшай праваабарончай і адвакацыйнай працы.

## 1.3. Адвакацыя і экспертная дзейнасць

Цягам 2025 года мы істотна ўзмацнілі адвакацыйную і прадстаўнічую працу на міжнародным узроўні. Зладзілі не менш за **50 працоўных сустрэч і перамоваў**. Такі падыход дазваляе сістэмна прадстаўляць інтарэсы беларускага культурніцкага сектара і выбудоўваць доўгатэрміновыя партнёрствы.

### Ключавыя падзеі і міжнародныя пляцоўкі

- Экспертны Форум Астрожскіх (Львоў) – упершыню на форуме мы арганізавалі асобную панэль, прысвечаную супрацы беларускай і ўкраінскай культур у дэкаланіяльным вымярэнні.

- Касцюшкаўскі форум МЗС Польшчы ў Гданьску – суарганізавалі і мадэравалі панэль «Культура», забяспечыўшы прысутнасць культурніцкай павесткі на гэтай дыпламатычнай пляцоўцы.

- Senior Officers Meeting (SOM) у Бруселі – удзел у прэзентацыі Дарожнай мапы падтрымкі беларускай культуры на міжнародным узроўні.

- Кангрэс беларускіх даследчыкаў у Берліне – выступ на панэлі, прысвечанай музейнай справе і міжнародным праектам у культурнай сферы.

- З’езд RESET! у Скоп’і – удзел у працы сеткі і абмеркаваннях агульных адвакацыйных падыходаў.

- З’езд Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства ў Бруселі – удзел у рабочых групах і дыскусіях.

- Канферэнцыя Belarus: *A Part of or Apart from Europe’s Security?* у Бруселі – прэзентацыя аналітычнага дакумента, прысвечанага культуры як фактару бяспекі.

- Канферэнцыя выдаўцоў культурніцкіх часопісаў краін Паўночнай Еўропы і Балтыі ў Гётэбургу – прэзентацыя пра стан культурніцкай журналістыкі і культурніцкіх медыяў Беларусі.

### Стратэгічныя сустрэчы і перамовы

Вялікабрытанія (Лондан) – удзел у стратэгічным дыялогу і шэрагу сустрэч на дзяржаўным узроўні з брытанскім бокам.

Сустрэча са спецыяльным дакладчыкам ААН па Беларусі.

Польшча – працоўныя сустрэчы з Міністэрствам замежных спраў, а таксама з гарадскімі структурамі (сфера культуры і міжнароднае супрацоўніцтва).

Эстонія (Талін) – сустрэчы з Міністэрствам культуры, МЗС і культурніцкімі фондамі; абмеркаванне мадэляў культурніцкай палітыкі, фінансавання і магчымасцяў стажыровак для беларускіх творцаў.

### Іншыя сустрэчы і кантакты

Перамовы з еўрапейскімі культурнымі і даследчымі інстытуцыямі;

Кантакты з музейнымі ўстановамі і прафесійнымі супольнасцямі;

Сустрэчы з экспертамі і ініцыятывамі, што працуюць у сферы адвакацыі, культурніцкай палітыкі і міжнароднай салідарнасці.

## 1.4. Стварэнне інтэлектуальных пляцовак для стратэгічнага планавання і развіцця

Цягам 2025 года Форум культурніцкіх арганізацый, стварэнне якога было ініцыяванае намі ў 2023 годзе, працягваў фармавацца як рэгулярная прафесійная пляцоўка для ўзаемадзеяння беларускіх культурніцкіх актараў. Сёння ён развіваецца як супольная ініцыятыва больш чым 20 арганізацый, дзе ролю правядзення і мадэрацыі бяруць на сябе розныя ініцыятывы, мы ж падтрымліваем працэс і ўдзельнічаем у развіцці супольнасці.

II Форум культурніцкіх арганізацый адбыўся ў Беластоку (28–29 траўня 2025). Пляцоўка набыла выразна працоўны характар: удзельнікі дакладней сфармулявалі агульныя мэты, пачалі працаваць у тэматычных групах і зафіксавалі патрэбу ў рэгулярных сустрэчах для сінхранізацыі і супольнага планавання.

Форум працягваў актыўную працу ў перыяд паміж сустрэчамі: вялася камунікацыя ў працоўных чатах, адбываліся онлайн-сазвоны і ішла падрыхтоўка супольных праектаў. Восенню 2025 года быў запушчаны працэс пашырэння супольнасці і адбору новых удзельнікаў – пяць арганізацый далучацца да Форуму.

Наступны Форум пройдзе ў пачатку 2026 года на пляцоўцы Музея Вольнай Беларусі ў Варшаве.

## 1.5. Падвышэнне бачнасці культурніцкай павесткі праз медыя

У 2025 годзе мы мэтанакіравана працавалі над тым, каб **культурніцкая павестка заставалася бачнай у беларускіх і міжнародных медыях**, а тэмы незалежнай культуры, салідарнасці і доўгатэрміновай падтрымкі гучалі ў шырэйшым грамадскім і еўрапейскім кантэксце.

### Праца з медыямі

**Падтрымлівалі кантакты** з беларускімі СМІ і скіроўвалі экспертаў для каментароў і асвятлення культурніцкіх тэмаў;

Істотна ўзмацнілі **камунікацыю з замежнымі медыямі**, у выніку чаго з'явіўся шэраг публікацый пра беларускую культуру ў цэлым і праграму ArtPower Belarus у прыватнасці;

**Прадстаўлялі экспертызу і кантэкст** для міжнародных журналістаў і рэдакцый;

**Аказалі грантавую падтрымку шэрагу культурніцкіх медыяў**, спрыяючы іх устойлівасці і здольнасці працягваць працу ў складаных умовах.

### Міжнародныя публікацыі

**Linkiesta (Італія)** – артыкул пра ArtPower Belarus у кантэксце падтрымкі беларускай дыяспары;

**via.ritzau.dk (Данія)** – матэрыял пра вынікі першай эдыцыі ArtPower Belarus і значэнне еўрапейскай падтрымкі для пераследаваных творцаў;

**Taurillon.org (Германія / Францыя)** – публікацыя «Мастакі супраць дыктатуры» пра беларускіх творцаў і ArtPower Belarus.

**Сайт еўрапейскай сеткі RESET** – эсэ «Незалежная культура як інструмент трансфармацыі беларускага грамадства».

**The Quietus (Польшча / Вялікабрытанія)** – матэрыял пра музыку Цэнтральнай і Усходняй Еўропы са згадкай нашай працы і экспертызы.

## Праграма 2. Цэласнасць культурніцкай прасторы

### Мэты:

- аб'яднаць рэсурсы і ўдзельнікаў, стварыць інклюзіўную і бяспечную прастору для супрацы;
- умацаваць супольнасць і пераадолець бар'еры.

### 2.1. Рэалізацыя і падтрымка праектаў, якія аб'ядноўваюць дзеячаў культуры і аўдыторыю па абодва бакі мяжы

У 2025 годзе мы працягвалі рэалізоўваць і падтрымліваць ініцыятывы, якія злучаюць дзеячаў культуры і іх аўдыторыю па абодва бакі мяжы, з фокусам на ўстойлівае развіццё, веды і захаванне культурнай памяці.

Завяршылі поўны цыкл адукацыйнага праекта для арт- і культурніцкіх менеджараў (сустрэчы, лекцыі, рэтрыт, выніковыя матэрыялы і архіў), правялі некалькі ментарскіх праграм і пітчынгаў, запускалі і ўмацоўвалі прафесійныя супольнасці.

Кансультавалі і суправаджалі больш за 10 ініцыятыў – ад даследчых і мастацкіх праектаў да IT- і стартап-рашэнняў, у тым ліку з фінансавай падтрымкай, дапамогай у фандрайзе і працы з аўтарскімі правамі. Частка гэтай працы застаецца непублічнай, але кожны падтрыманы праект мае рэальны ўплыў у сваёй супольнасці.

## 2.2. Удзел у міжнародных сетках і асацыяцыях

Мы свядома ўдзельнічаем у міжнародных сетках і асацыяцыях і ўкладваем у гэта рэсурсы, бо для культурніцкага сектара такая актыўнасць – не «пратакол», а спосаб захоўваць бачнасць і ўплываць на працэсы. Праз гэтыя платформы беларускія актары застаюцца ў прафесійным дыялогу з Еўропай і рэгіёнам, фармулююць свае патрэбы, удзельнічаюць у сумеснай адвакацыі і ўплываюць на тое, як культура ўспрымаецца ў шырэйшых грамадскіх і палітычных працэсах.

У 2025 годзе мы актыўна працавалі ў міжнародных фарматах.

У межах RESET! (еўрапейская сетка культурніцкіх арганізацый, якая працуе з тэмамі салідарнасці, свабоды выказвання і падтрымкі незалежнай культуры ў складаных кантэкстах) мы ўдзельнічалі ў Генеральнай асамблеі і іншых сустрэчах. Таксама працягваем супрацу ў сталым фармаце працоўнай групы Non-European Voices (збіралі патрэбы і абмяркоўвалі магчымыя сумесныя адвакацыйныя дзеянні менавіта з удзельнікамі, якія паходзяць з краін па-за Еўрапейскім Саюзам). Адным з вынікаў стаў аналітычны тэкст пра незалежную беларускую культуру як фактар грамадскіх трансфармацый, апублікаваны на пляцоўцы сеткі. Гэты матэрыял зрабіў беларускі кантэкст бачным для шырэйшай аўдыторыі.

ENCATC (еўрапейская сетка ў сферы культурніцкага менеджменту, адукацыі і культурніцкіх палітык) – прынялі рашэнне пра ўдзел і падрыхтавалі далучэнне з 2026 года, каб інтэграваць беларускі досвед у еўрапейскія дыскусіі і развіваць доўгатэрміновыя прафесійныя сувязі.

Форум грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства (рэгіянальная платформа, якая аб’ядноўвае НДА краін Усходняга партнёрства для дыялогу і адвакацыі). На працягу года ўдзельнічалі ў працы тэматычнай рабочай групы, абмеркаваннях стратэгіі і ўнутранай арганізацыі Форуму, уносілі прапановы па сістэматызацыі працы і фандрайзінгу, а таксама прадстаўлялі культурніцкі сектар на штогадовым Форуме грамадзянскай супольнасці ў снежні ў Бруселі.

Independent Cultural Organisations Network (міжнародная сетка незалежных культурных арганізацый краін Усходняга партнёрства, якая займаецца супольнымі даследаваннямі і адвакацыяй у еўрапейскім

кантэксце). Далучыліся да сумеснага міжнароднага даследчага праекта, прысвечанага ўплыву міграцыі творцаў на культуры краін Усходняга партнёрства за апошнія пяць гадоў. Гэтай працай, у стварэнні якой мы выступалі ў ролі кансультантаў, уключаем беларускі досвед у агульную карціну рэгіёну, каб ён быў бачны і ўлічаны ў еўрапейскім дыялогу.

### 2.3. Прасоўванне беларускай культуры на міжнародных платформах і мерапрыемствах

У 2025 годзе мы сістэмна працавалі над тым, каб беларуская культура станавілася бачнай, пазнавальнай і ўключанай у міжнародны кантэкст, нягледзячы на ізаляцыю і абмежаванні. Гаворка ідзе не пра разавыя выхады, а пра стварэнне інфраструктуры і доўгатэрміновых каналаў прасоўвання.

У гэтым кірунку працуем праз грантавую падтрымку, кансультаванне і міжнародную прысутнасць, у тым ліку дзякуючы наступным дзеянням:

- Удзел у сумесным праекце каталогу сучаснай беларускай культуры (інструмент доўгатэрміновай міжнароднай прамоцыі);
- Удзел у музычным шоўкейсе BUSH (Будапешт) – для наладжвання кантактаў у міжнароднай музычнай індустрыі;
- Падтрымка беларускага стэнду на найбуйнешай у свеце IT-падзеі Web Summit у Партугаліі і праца з камунікацыйнай рамкай і прома-матэрыяламі;
- Прысутнасць і нетворкінг на саміце Impact як пляцоўцы для дыялогу паміж культурай, інавацыямі і сацыяльнымі зменамі;
- Падтрымка міжнародных мабільнасцяў беларускіх культурніцкіх дзеячаў, спрыянне ўдзелу беларускіх праектаў у міжнародных фестывалях і выставах (спосаб уключэння беларускай культуры ў глабальны прафесійны кантэкст).

## Праграма 3. Творца і яго мастацтва як каштоўнасць

**Мэты:**

- забяспечыць творцам доступ да рэсурсаў, адукацыі, гуманітарнай і прававаой падтрымкі;
- стварыць бяспечныя ўмовы для творчага развіцця і самарэалізацыі.

## 3.1. Стварэнне і рэалізацыя рэсурсных праграм для фінансавання культурніцкіх праектаў (субгрантынг, спонсарская падтрымка, краўдфандынг)

У 2025 годзе мы сістэмна развівалі дзве ўстойлівыя мадэлі прыватнай доўгатэрміновай падтрымкі культуры. Гаворка ідзе пра праект “Беларускія Магістраты” і Клуб беларускіх мецэнатаў. Абедзве мадэлі аб’ядноўваюць людзей вакол беларускай культуры як каштоўнасці, дазваляюць прыцягваць прыватныя сродкі і скіроўваць іх на культурніцкія і даследчыя праекты (тут працуюць пазрыстыя правілы, супольныя рашэнні і давер).

З дапамогай гэтых інструментаў **за 2025 год былі падтрыманыя 20 культурніцкіх і даследчых праектаў**, а ўсяго з моманту запуску абедзвюх мадэляў – больш за 30 праектаў. Сярод іх – тэатральныя пастаноўкі, выданне кніг, медыя, выставы і міжнародныя паказы; значная частка падтрымкі пры гэтым застаецца непублічнай, у тым ліку ўнутры Беларусі.

Асобным напрамкам стала вяртанне і захаванне важных культурніцкіх артэфактаў. Сіламі супольнасці мецэнатаў былі выкупленыя прадметы і архівы, якія знаходзіліся ў прыватных калекцыях ці нават лічыліся страчанымі. Сярод вернутых у публічную прастору артэфактаў – мапа Вялікага Княства Літоўскага. Гэты асобнік паходзіць з атласа, апублікаванага ў Амстэрдаме ў 1649 годзе. Таксама Клубам была выкупленая кніга-травелог Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі «Перэгрынацыя, або Паломніцтва ў Святую зямлю» (на лацінскай мове, выданне датуецца 1614 годам).

Вакол кожнага з артэфактаў лагічна разрастаецца праект папулярызацыі: ладзім лекцыі, выставы, ініцыюем даследаванні і нават маем выдавецкія планы. Вельмі важна, каб гэтыя прадметы станавіліся часткай жывой памяці, былі даступныя шырокай аўдыторыі і захоўваліся для наступных пакаленняў.

## 3.2. Прававая абарона і персанальная падтрымка для беларускіх творцаў (пашырэнне дапамогі, супрацоўніцтва з праваабарончымі арганізацыямі)

На фоне **працяглых і сістэмных рэпрэсій у Беларусі** галіна культуры застаецца адной з уразлівых сфераў. Мы фіксуем рост ціску на дзеячаў культуры: затрыманні, вобшукі, адміністрацыйныя арышты, крымінальныя справы за публічную дзейнасць, разбурэнне незалежных архіваў і паступовы захоп культурніцкіх інстытуцый прарасійскімі актарамі.

У 2025 годзе наш кірунак “Дапамога” працягваў падтрымліваць беларускіх дзеячаў культуры, якія сутыкнуліся з рэпрэсіямі, вымушанай эміграцыяй, крызіснымі жыццёвымі сітуацыямі. Год стаў перыядам усталявання большай стабільнасці, удасканалення ўнутраных працэсаў, развіцця партнёрскіх сувязяў і паглыблення экспертызы.

Асноўнымі кірункамі працы заставаліся:

- Кансультаванне (юрыдычнае, псіхалагічнае, фінансавае, візавае і інш.);
- Фінансавая, псіхалагічная і візавая падтрымка;
- Падрыхтоўка рэкамендацыйных лістоў і хадайніцтваў (у тым ліку для міграцыйных органаў, фондаў, праваабарончых структур);
- Збор і аналіз інфармацыі пра палітвязняў з ліку дзеячаў культуры;
- Маніторынг патрэбаў культурніцкай супольнасці праз даследаванні, анкетаванні і непасрэдны кантакт з творцамі.

## Агульныя вынікі і статыстыка

За 2025 год мы апрацавалі **257 зваротаў** ад дзеячаў культуры.

- Правялі **192 кансультацыі** (у тым ліку псіхалагічныя, фінансавыя, юрыдычныя, візавыя, па працаўладкаванні);
- Падрыхтавалі **29 рэкамендацыйных і хадайніцкіх лістоў** (тым ліку для легалізацыі ў розных краінах, сярод якіх – Літва, Польшча, Грузія і Партугалія);
- **51 бенефіцыяр** атрымаў грашовыя выплаты.

Акрамя таго:

- Стварылі сістэму падтрымкі па прынцыпе “one-stop”, якая аб’яднала фінансаванне, кансультацыі, псіхалагічную і візавую дапамогу, а таксама суправаджэнне па пытаннях легалізацыі і працягу творчай дзейнасці;
- Наладзілі хуткае рэагаванне на экстранныя сітуацыі з фінансавай падтрымкай людзей, якія трапілі ў складанае становішча;
- Падтрымалі шэраг творчых ініцыятыў, у тым ліку тэатральныя і выставачныя праекты, дзіцячая анімацыя і інш.;
- Падрыхтавалі гід па арганізацыях (міжнародных і беларускіх), што дапамагаюць дзеячам культуры;
- Правялі анкетаванне “Патрэбы і праблемы дзеячаў культуры ў эміграцыі” (28 апрацаваных адказаў);
- Зладзілі даследаванне “Праблемы і патрэбы дзеячаў культуры ў Беларусі” (8 паглыбленых інтэрв’ю, 8 апрацаваных анкет).

Атрыманыя ў выніку анкетавання і даследавання дадзеныя сталі асновай для стратэгічнага планавання новых праектаў і далейшага развіцця кірунка на 2026–2027 гады.

## 3.3. Арганізацыя і падтрымка адукацыйных трэкаў і навучальных праграм для павышэння кваліфікацыі творцаў у культурніцкім менеджменце

Асноўная адукацыйная праца ў 2025 годзе ладзілася ў межах праграмы ArtPower Belarus і была скіраваная на павышэнне кваліфікацыі беларускіх творцаў і культурніцкіх арганізацый у сферы культурніцкага менеджменту. Мы сканцэнтраваліся на практычных фарматах, якія дапамагаюць камандам лепш арыентавацца ў грантавых працэсах, ацэньваць уласны арганізацыйны патэнцыял і планаваць устойлівае развіццё ў складаных умовах.

У межах гэтага кірунку:

- Правялі ментарынг для **33 арганізацый** (ацанілі каманды, ролі, працэсы, мэты і рэсурсы);
- Зладзілі **6 інфасесій** па грантавых працэсах і тыповых памылках (212 удзельнікаў);
- Арганізавалі **6 воркшопаў** па праектным менеджменце і ўстойлівасці ініцыятыў (118 удзельнікаў);
- Забяспечылі онлайн-доступ да ўсіх ключавых падзей і падрыхтавалі відэаінструкцыю, як падаць заяўку;
- Апублікавалі адукацыйныя відэаматэрыялы, якія сукупна набралі каля **1,5 тысяч праглядаў**

Агульны ахоп адукацыйнага трэка за год – не менш за 330 удзельнікаў.

## 3.4. Субгрантынг на творчыя і іншыя праекты атрыстаў

Субгрантынг у 2025 годзе адбываўся праз праграму ArtPower Belarus, якую рэалізуем разам з Дацкім інстытутам культуры.

Сумесна з партнёрамі падрыхтавалі і зладзілі першае кола грантавага конкурсу: правялі інфасесіі, кансультацыі і воркшопы, арганізавалі працу экспертнай супольнасці і адбор па ўсіх трох трэках; запусцілі новае кола ў межах другога трэка.

На аснове атрыманага раней досведу аптымізавалі працэсы, падрыхтавалі ўніфікаваныя гайдлайны па справаздачнасці, распачалі кантрактаванне, выплаты і маніторынг падтрыманых праектаў.

Усяго падтрымалі **49 праектаў**, у іх ліку:

- 9 – трэк 1 (арганізацыйнае развіццё);
- 26 – трэк 2 (творчыя праекты);
- 14 – трэк 3 (праекты ў асаблівых абставінах).

Сярод падтрыманых – праекты ў сферах выканальніцкіх і візуальных мастацтваў, літаратуры і выдавецкай справы, музыкі і гукавога мастацтва, кіно і тэлебачання, культурніцкай адукацыі і даследаванняў, новых медыя і прамоцыі, а таксама ініцыятывы супольнасцяў і прафесійных асацыяцый. Такі міжсектаральны ахоп сведчыць пра імкненне захоўваць баланс паміж творчымі практыкамі, інфраструктурнымі праектамі і развіццём супольнасці ў цэлым.

Пасля старту першых колаў праграмы (летам 2025 года) мы атрымалі:

- амаль **300 заявак**;
- агульны запыт – больш за **6 млн еўра**.

Падтрыманы **17,1% заяўнікаў**: быў ухвалены ў сярэднім **кожны шосты** пададзены на конкурс праект.

Нягледзячы на складаную сітуацыю і высокія рызыкі, мы працягваем падтрымліваць культурніцкія праекты, якія рэалізуюцца ўнутры Беларусі ці маюць трансгранічны фармат. Такая супраца патрабуе асаблівай асцярожнасці, гнуткасці і даверу, але застаецца прынцыпова важнай для захавання жывой прысутнасці ўнутры краіны і для падтрымання сувязяў паміж беларускімі творцамі і міжнароднай прасторай.

## Што мы зрабілі для інстытуцыйнага развіцця арганізацыі

У 2025 годзе мы сканцэнтраваліся на інстытуцыйным умацаванні Беларускай Рады культуры, каб забяспечыць устойлівую працу арганізацыі ў сярэднетэрміновай перспектыве.

Апроч распрацоўкі і прэзентацыі Стратэгіі, падрыхтавалі падрабязны аперацыйны план на 2026–2027 гады з паказчыкамі эфектыўнасці. Дакумент стане асновай для двухгадовага бюджэтавання і планавання дзейнасці.

Сфармавалі Праўленне арганізацыі і правялі чатыры пасяджэнні, у межах якіх удасканальвалі Рэгламент і асноўныя ўнутраныя дакументы.

Распрацавалі і зацвердзілі Рэгламент дзейнасці, а таксама завяршылі Code of Conduct, які рэгулюе этычныя нормы, унутраную камунікацыю і працэдуры вырашэння канфліктаў.

Падрыхтавалі і падпісалі ключавыя палітыкі і палажэнні: уліковую палітыку, палажэнне аб закупках і санкцыйную палітыку; працягваецца праца над фінансавай палітыкай і палітыкай бяспекі.

Завяршылі значны этап арганізацыйнага развіцця, у тым ліку адаптацыю да зменаў у фінансаванні і ўнутраных працэсах.

Сістэматызавалі гісторыю праектнай дзейнасці арганізацыі – на сёння

яна складае амаль **60 праектаў**, рэалізаваных самастойна, у партнёрстве або ў якасці фіскальнага партнёра.

Прайшлі аўдыт па чатырох праектах, што пацвердзіла якасць фінансавых працэсаў і надзейнасць пратаколаў працы з інфармацыяй.

Наладзілі сістэму ўнутранай камунікацыі, абмену дадзенымі і распрацавалі базавыя пратаколы бяспекі для працы з грантаатрымальнікамі і партнёрамі.

## Як мы камунікавалі з аўдыторыяй

У 2025 годзе мы выбудоўвалі камунікацыю з аўдыторыяй як сістэмную працу, скіраваную на павышэнне празрыстасці, тлумачэнне нашай дзейнасці і пашырэнне бачнасці беларускай культуры ў міжнародным кантэксце.

### Медыйная прысутнасць

За год мы зафіксавалі **каля 70 згадак Беларускай Рады культуры ў СМІ** – у тым ліку аўтарскія матэрыялы, перадрукі, партнёрскія публікацыі, інтэрв’ю, ускосныя каментары і пасты ў сацыяльных сетках.

Асноўныя тэмы згадванняў:

- **ArtPower Belarus** – найбольш пазнавальная тэма; у медыя абмяркоўвалі вынікі праграмы, працяг грантавага конкурсу і розныя ацэнкі яе рэалізацыі;
- **Аналітыка і даследаванні** – матэрыялы пра стан культуры ў Беларусі і за яе межамі;
- **Адвакацыя і культурніцкія падзеі** – сустрэчы, публічныя выступы і прасоўванне новых ідэй;
- **Салідарнасць і міжнародны кантэкст** – згадкі ў сувязі з міжнароднымі падзеямі і падтрымкай з боку еўрапейскіх структур.

### Статыстыка сайту і сетак

За 2025 год сайт byculture.org меў каля **8,4 тыс. карыстальнікаў і 43 тыс. праглядаў**. Асноўны інтарэс засяроджаны вакол ArtPower Belarus: старонкі праграмы і навіны пра конкурсы і іх вынікі ўваходзяць у топ самых прагляданых разам з галоўнай старонкай.

Фармальна ў геаграфіі лідары **Польшча, ЗША, Літва, Германія, Кітай, Францыя і Нідэрланды**. Аднак з улікам высокай долі прамога трафіку, папулярнасці беларускамоўных старонак, значнай колькасці загрузак дакументаў і актыўнасці паводле мінскага часу, можна меркаваць, што каля **25–35%** наведванняў фактычна адбываюцца з **Беларусі**, але фіксуюцца аналітыкай як уваходы з іншых краін праз VPN.

## Брэнд і візуальная ідэнтычнасць

У межах распрацоўкі новай стратэгіі мы абнавілі **брэндбук Беларускай Рады культуры**, стварылі **невялікі набор мерчу** і распрацавалі **асобны брэнд для праграмы ArtPower Belarus**. Гэта стала часткай працы над пазнавальнасцю, цэласнасцю і сучаснай мовай камунікацыі арганізацыі.

Каб заўсёды быць у курсе галоўных навінаў Беларускай Рады культуры, падпішыцеся на newsletter (на англійскай мове) і зазірайце на наш сайт byculture.org.